*УДК 947.6–058.232.6 «1966/1975»+323.325 (476)(091)«1966/1975»*

*Н. В. ЗАЙЦАВА*

# СТАНАЎЛЕННЕ СІСТЭМЫ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ КАЛГАСНАГА СЯЛЯНСТВА БССР (1966–1975 гг.)

*Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 20. 10.2009)*

Рэпазіторый БНТУ

Важнай формай станаўлення сістэмы сацыяльнай абароны калгаснага сялянства БССР у даследуемы перыяд з'яўлялася сацыяльнае страхаванне. Яно выяўляла адносіны, якія складваліся паміж асобай і грамадствам, асобай і дзяржавай з нагоды размеркавання і выкарыстання часткі цэнтралізаванага прыбытку грамадства для задавальнення патрэбнасцей часова непрацаздольнага насельніцтва (дапамога па цяжарнасці і родах, па часовай непрацаздольнасці), для падтрымання і ўзнаўлення здароўя працаўнікоў і членаў іх сем'яў (санаторна-курортнае лячэнне, утрыманне дамоў адпачынку, піянерскіх лагераў). У аснове савецкага сацыяльнага страхавання знаходзілася працоўная страхавая праграма, распрацаваная У. І. Леніным і прынятая Пражскай канферэнцыяй РСДРП у студзені 1912 г. З тых часоў сацыяльнае страхаванне прайшло складаны шлях развіцця і станаўлення.

Сацыяльнае страхаванне калгаснікаў мела свае асаблівасці ў параўнанні з сістэмай сацыяльнага страхавання рабочых і служачых, абумоўленай адрозненнем дзвюх формаў уласнасці на сродкі вытворчасці. На ранняй стадыі сацыялістычнага будаўніцтва дзяржава не мела досыць рэсурсаў, каб стварыць адзіную для ўсіх працаўнікоў сістэму сацыяльнага страхавання. Таму сацыяльнае страхаванне калгаснікаў доўгі час знаходзілася ў распараджэнні саміх калектыўных гаспадарак. Кожны калгас, зыходзячы з магчымасцей, усталёўваў свае нормы, замацоўваючы іх у Статуце сельскагаспадарчай артэлі. У сувязі з гэтым назіралася вялікае разыходжанне ў нормах і памерах выплат па сацыяльным страхаванні ў розных раёнах рэспублікі, а часам і ў калгасах. У асобных калгасах наогул адсутнічалі выплаты па некаторых відах сацыяльнага страхавання. Так, з 15 калгасаў Ваўкавыскага р-на Гродзенскай вобл. выплаты па часовай непрацаздольнасці, па цяжарнасці і родах у 1965 г. ажыццяўляліся толькі ў шасці гаспадарках, у 1966 г. – у сямі, у 1967 г. – у дзесяці калгасах раёна [1, л. 75, 84; 2, л. 27, 123; 3, л. 113, 127], а калгасы «Звязда» і імя Свярдлова не выплачвалі гэтыя віды дапамогі аж да 1970 г. [4, л. 117, 127]. Аналагічная сітуацыя назіралася ў іншых раёнах і абласцях рэспублікі. Прычынай такога становішча з'яўлялася адсутнасць фінансавай магчымасці калгасаў для забеспячэння сваіх працаўнікоў такімі дапамогамі.

Развіццё і ўдасканаленне сельскагаспадарчай вытворчасці, дабрабыт калгаснікаў шмат у чым залежалі ад працы механізатараў і спецыялістаў, таму гэтыя катэгорыі працаўнікоў сяла ў першую чаргу былі ахоплены сістэмай дзяржаўнага сацыяльнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання па правілах і нормах для рабочых і служачых. У будучым такая сістэма сацыяльнага страхавання была распаўсюджана і на астатніх членаў калгасаў. Трэці Усесаюзны з'езд калгаснікаў прыняў пастанову, у адпаведнасці з якой з 1 красавіка 1970 г. была ўведзена адзіная сістэма сацыяльнага страхавання для членаў калгасаў. Яна ўключала выплату дапамогі па часовай непрацаздольнасці, па цяжарнасці і родах, на нараджэнне дзіцяці, пахаванне, перакваліфікацыю, набыццё пуцёвак у санаторыі, дамы адпачынку, піянерскія лагеры для дзяцей.

Адным з асноўных відаў сацыяльнага страхавання з'яўляліся выплаты па часовай непрацаздольнасці, якія ўяўлялі з сябе састаўную частку фонду жыццёвых сродкаў для ўзнаўлення працоўнай сілы.

Напрыклад, у калгасах Віцебскай вобл. з ростам вытворчасці валавога прыбытку ў разліку на аднаго сярэднегадовага працаўніка ў такой жа паслядоўнасці, хоць і пры вядомым адставанні ад рабочых і служачых, узрастаў і фонд сацыяльнага страхавання. За пяць гадоў калгасы Верхнядзвінскага р-на больш чым у 2 разы павысілі выплаты па часовай непрацаздольнасці [5, л. 23, 156, 179, 200]. Аналагічная сітуацыя назіралася і ў іншых абласцях рэспублікі.

З увядзеннем адзінай сістэмы сацыяльнага страхавання члены ўсіх калгасаў забяспечваліся дапамогай, зыходзячы з адзіных для ўсёй краіны правілаў і нормаў. З гэтай мэтай быў створаны цэнтралізаваны саюзны фонд сацыяльнага страхавання калгаснікаў, асновай якога з'яўляліся ўзносы калгасаў у памеры 2,4% ад фонду аплаты па працы. Непасрэдна члены калгасаў ніякіх узносаў па сацыяльным страхаванні не ўносілі.

Дыялектыка росту адлічэнняў калгасаў у цэнтралізаваны фонд сацыяльнага страхавання была такая, што гэты рост залежаў ад павелічэння фонду аплаты працы, які ў сваю чаргу вызначаўся агульным узроўнем развіцця грамадскай гаспадаркі, перш за ўсё аб'ёмам вытворчасці зноў створанай вартасці – валавога прыбытку. За пяць гадоў фонд аплаты працы ў калгасах БССР павялічыўся на 22%. У сувязі з гэтым выраслі і адлічэнні ў цэнтралізаваны фонд сацыяльнага страхавання адпаведна на 49,5%. Да канца дзявятай пяцігодкі сацыяльным страхаваннем у рэспубліцы было ахоплена каля 1,7 млн працаўнікоў сельскай гаспадаркі.

Сродкі фонду сацыяльнага страхавання накіроўваліся перш за ўсё на аказанне матэрыяльнай дапамогі членам калгасаў. Дапамога па часовай непрацаздольнасці выдавалася ў выпадку хваробы, санаторна-курортнага лячэння, хваробы члена сям'і, карантыну, часовага пераходу на іншую працу, у сувязі з захворваннем туберкулёзам або прафесійным захворваннем, пратэзіраваннем са змяшчэннем у стацыянар.

Памер дапамогі па часовай непрацаздольнасці залежаў як ад захворвання, так і ад бесперапыннага стажу працы. Дапамога па часовай непрацаздольнасці, якая наступіла ў выніку прафесійнага захворвання або працоўнага калецтва, а таксама працуючым інвалідам Вялікай Айчыннай вайны выплачвалася ў памеры 100% заробку. У астатніх выпадках памер дапамогі залежаў ад бесперапыннага стажу працы, але не залежаў ад працягласці працы ў калгасе [6, л. 17, 27].

Усталяваны парадак забеспячэння па сацыяльным страхаванні ствараў спрыяльныя ўмовы для добрасумленна працуючых калгаснікаў. Усе калгаснікі, якія добра працавалі ў грамадскай гаспадарцы, атрымлівалі дапамогу па часовай непрацаздольнасці і карысталіся льготамі па сацыяльным страхаванні. Разам з тым асобы, якія ўхіляліся ад актыўнага ўдзелу ў грамадскай вытворчасці, гультаі, п'яніцы не маглі карыстацца яго выгодамі. Калі калгаснік да наступлення часовай непрацаздольнасці не выходзіў на працу без уважлівых прычын, быў выключаны за парушэнне Статуту калгаса або па іншых прычынах, то дапамога яму не выплачвалася.

З ростам фонду аплаты працы павялічвалася ўдзельная вага ў ім выплат па часовай непрацаздольнасці. Гэтая тэндэнцыя была абумоўлена ўзрастаннем сярэдняга памеру дапамогі па часовай непрацаздольнасці. Калі разгледзець у якасці прыкладу Магілёўскую вобл., то фонд аплаты працы членаў калгасаў з 1970 па 1975 г. павялічыўся на 59%, а выплаты па часовай непрацаздольнасці – больш чым у 3 разы. Сярэдні памер дзённай дапамогі за гэты ж перыяд па вобласці ўзрос больш чым у 2 разы, а яго велічыня ў параўнанні з сярэднядзённай аплатай працы павялічылася на 17,4% [6, л. 108; 7, л. 92, 124; 8, л. 112].

Напрыклад, у Шклоўскім р-не Магілёўскай вобл. сярэдні памер дзённай дапамогі павялічыўся ў 2 разы, а яго велічыня ў параўнанні з сярэднядзённай аплатай працы – на 12,6% [8, л. 113]. Падобная сітуацыя назіралася і ў астатніх абласцях і раёнах рэспублікі.

Значнае месца ў фондзе сацыяльнага страхавання займалі выплаты на санаторна-курортнае лячэнне і адпачынак працаўнікоў сяла, утрыманне піянерскіх лагераў для дзяцей. Сэнс гэтай формы размеркавання заключаўся ў тым, што яна прама і непасрэдна была звязана з размеркаваннем матэрыяльных выгод, з узнаўленнем працоўнай сілы, паколькі забяспечвала задавальненне фізічных патрэбнасцей працаўнікоў і членаў іх сем'яў. Пуцёўкі ў санаторыі, дамы адпачынку і піянерскія лагеры выдаваліся бясплатна альбо з частковай аплатай.

Даныя паказваюць, што найбольшую ўдзельную вагу ў смеце расходаў цэнтралізаванага саюзнага фонду сацыяльнага страхавання мелі выплаты па часовай непрацаздольнасці. Яны

Репозиторий БНТУ

складалі ў сярэднім 55,5% агульнай сумы. Аднак удзельная вага гэтых выплат скарацілася з 79% у 1970 г. да 52% у 1975 г. Гэты факт тлумачыўся тым, што нараўне з ростам выдаткаў на гэтыя мэты павялічваўся сярэдні памер дапамогі, таксама значную ролю адыграла работа па прафілактыцы захворванняў. Так, сярэдні памер дзённай дапамогі па часовай непрацаздольнасці з 1970 па 1975 г. па БССР павялічыўся з 1 руб. 81 кап. да 2 руб. 57 кап.

Удзельная вага выдаткаў на санаторна-курортнае лячэнне і адпачынак узрасла з 10,2% у 1970 г. да 14,1% у 1975 г. Такую ж тэндэнцыю мелі выдаткі на ўтрыманне піянерскіх лагераў і санаторнае лячэнне дзяцей калгаснікаў, якія павялічыліся за гэты перыяд у 8 разоў, а іх удзельная вага павысілася на 3,4%. Доля астатніх выдаткаў фонду нязначная, за выключэннем іншых расходаў, якія склалі ў 1972–1973 гг. у сярэднім 59%, а ў 1975 г. – 26,8% агульнай сумы выдаткаў. Гэта тлумачылася тым, што да іншых расходаў былі аднесены выдаткі на будаўніцтва санаторна-курортных устаноў, рамонт піянерскіх лагераў і набыццё абсталявання. У 1972 і 1973 гг. выдаткі на рамонт піянерскіх лагераў і набыццё абсталявання склалі адпаведна 637 і 450 тыс. руб., а на будаўніцтва санаторна-курортных устаноў у 1973 г. – 562 тыс. руб., у 1975 г. – 2942,8 тыс. руб.

Аналізуючы даныя станаўлення сацыяльнага страхавання калгаснага сялянства рэспублікі, нельга не ўлічваць і тое, што ў разглядаемы перыяд узрастала колькасць членаў дзяцей прафсаюзаў, адпачываючых у піянерскіх лагерах. Так, у 1970 г. у Верхнядзвінскім р-не Віцебскай вобл. адпачылі 95 дзяцей калгаснікаў, да 1972 г. іх колькасць узрасла да 116 чал., у 1975 г. – да 158 чал. [6, л. 113].

Аднак неабходна адзначыць, што сродкі цэнтралізаванага саюзнага фонду сацыяльнага страхавання калгаснікаў у першыя гады існавання выкарыстоўваліся нядосыць. Так, у цэлым сродкі фонду ў 1970 г. былі выкарыстаны толькі на 43%, у 1971 г. – на 61,7, на выплату дапамогі па часовай непрацаздольнасці ў 1970 г. выкарыстаны на 45,8 [11, л. 20, 44], у 1971г. – 59,3% [6, л. 33, 43]. Сродкі на санаторна-курортнае лячэнне і адпачынак у 1970 г. былі выкарыстаны толькі на 35,9 %. Галоўная прычына такой з'явы заключалася ў тым, што асігнаваныя па смеце пуцёўкі былі забяспечаны толькі на 50%, што абмяжоўвала магчымасці адпачынку і лячэння калгаснікаў.

Характэрным прыкладам такой сітуацыі з'яўляецца Гродзенская вобл. У 1970 г. у вобласці колькасць працуючых калгаснікаў складала 186,7 тыс. чал., з іх адпачылі – 969 чал. [12, л. 170]. У 1970 г. у Ваўкавыскім р-не Гродзенскай вобл. было выдадзена толькі 8 пуцёвак у санаторыі і дамы адпачынку. У 1975 г. колькасць пуцёвак павялічылася да 19 [13, л. 60, 61].

Павысілася ўвага дзяржавы да праблем жанчыны-маці і юных жыхароў краіны. З 1965 г. жанчыны – члены калгасаў атрымалі права на адпачынак па цяжарнасці і родах нароўні з жанчынамі-рабочымі і служачымі. Памер дапамогі ўсталёўваўся камісіямі па прызначэнні пенсій і дапамог калгаснікам па сумесным прадстаўленні кіраўніцтву калгасаў і калгаснага савета сацыяльнага забеспячэння, а выплата дапамогі ажыццяўлялася раённымі аддзеламі сацыяльнага забеспячэння. З ліпеня 1965 г. у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР ад 9 красавіка 1965 г. быў уведзены новы, больш спрошчаны парадак прызначэння і выплаты дапамогі па цяжарнасці і родах жанчынам-калгасніцам. Дапамога стала прызначацца і выплачвацца непасрэдна ў калгасе. Памер дапамогі залежаў ад бесперапыннага стажу працы і працоўнага ўкладу ў грамадскую гаспадарку.

Развіццё дзяржаўнага сацыяльнага страхавання і, у прыватнасці, выплата дапамогі па цяжарнасці і родах жанчынам-калгасніцам абумовілі ўзрастанне гэтай формы размеркавання цэнтралізаванага прыбытку дзяржавы на карысць калгаснага насельніцтва.

Як сведчаць даныя, удзельная вага дапамогі па цяжарнасці і родах жанчынам-калгасніцам у агульнай суме выплат на гэтыя мэты ўзрасла з 6,9% у 1965 г. да 20,9% у 1970 г., пачала зніжацца з 1971 г., у 1972 г. яна склала 18,1 і павялічылася да 18,7% у 1975 г. Пры гэтым колькасць жанчын-калгасніц, якія атрымалі дапамогу па цяжарнасці і родах з 1965 па 1975 г., скарацілася на 12,7 тыс. Дадзенае пытанне заставалася сур'ёзнай праблемай не толькі для жанчын-калгасніц, але і для ўсіх жанчын краіны аж да канца мінулага стагоддзя. З аднаго боку, у параўнанні з мінулым перыядам такія сацыяльныя гарантыі з'яўляліся значным дасягненнем, з другога – іх было недастаткова.

Рэпазіторый БНТУ

Адной з форм сацыяльнага страхавання з'яўлялася дапамога на нараджэнне дзіцяці, якая выдавалася аднаму з бацькоў, калі заробак яго не перавышаў 60 руб., улічваючы даплаты і прэміі. Аднак гэтая форма сацыяльнага страхавання не мела шырокага распаўсюджання, паколькі аплата працы большасці членаў калгасаў перавышала гэты мінімум. Сумы сродкаў на гэтыя мэты выкарыстоўваліся, як было адзначана раней, толькі на 15–20%.

Значнай вяхой у сацыяльным забеспячэнні калгаснага сялянства з'явіўся Закон аб пенсіях і дапамогах членам калгасаў, прыняты Вярхоўным Саветам СССР у 1964 г. Дзяржаўнымі пенсіямі сталі забяспечвацца ўсе працаўнікі краіны. Пенсіённае забеспячэнне калгаснікаў да таго ж узмацняла матэрыяльную зацікаўленасць кожнага члена калгаса ў выніках сваёй працы і тым самым пазітыўна адбівалася на развіцці вытворчасці.

З 1965 г. сфера дзеяння Закона аб пенсіях і дапамогах членам калгасаў пашырылася. Правілы і парадак прызначэння пенсій калгаснікам былі распаўсюджаны на былых калгаснікаў, землі якіх былі перададзены саўгасам, іншым прадпрыемствам і арганізацыям. У адпаведнасці з гэтай пастановай пенсіі па старасці сталі атрымліваць і тыя, якія ўступілі ў калгас у першыя гады калектывізацыі і выбылі з яго па прычыне старасці і інваліднасці.

Аб маштабах пенсіённага забеспячэння калгаснікаў у краіне даюць уяўленне лічбы аб росце колькасці пенсіянераў-калгаснікаў. Колькасць асоб, атрымліваючых пенсіі, да 1975 г. дасягнула 1741 тыс. чал. [14, с. 330; 16, с. 226], у тым ліку пенсіянераў-калгаснікаў – 704 тыс., што складала 40% агульнай колькасці пенсіянераў у рэспубліцы. Колькасць пенсіянераў у 1975 г. у параўнанні з 1965 г. павялічылася на 321 тыс. чал. [15, с. 215]. Колькасць пенсіянераў, былых членаў калгасаў, засталася прыкладна на тым жа ўзроўні, а іх доля ў агульнай колькасці пенсіянераў-калгаснікаў скарацілася на 5,1%. У БССР амаль кожны сёмы жыхар вёскі знаходзіўся на дзяржаўным пенсіённым забеспячэнні.

Трэба адзначыць, што рост агульнай колькасці людзей пенсіённага ўзросту ў значнай меры быў абумоўлены аб'ектыўнай агульнапланетарнай тэндэнцыяй старэння насельніцтва. Удзельная вага старэйшых узроставых груп у колькасці насельніцтва стала павялічвацца. Калі ў 1939 г. у СССР на 1000 чал. прыходзілася 73 чал. старэй за 60 гадоў, то ў 1959 г. – 94, у 1965 г. – 110, у 1970 г. – 118, у 1975 г. – 132 чал. [14, с. 330; 15, с. 110, 112].

Гэта тэндэнцыя была характэрна і для БССР. Да 1973 г. колькасць насельніцтва рэспублікі дасягнула ўзроўню 1940 г. і склала 9074 тыс. чал., а колькасць мужчын і жанчын старэй за 60 гадоў павялічылася з 659,8 да 1181,9 тыс., або ў 1,8 раза. У 1939 г. на 1000 жыхароў рэспублікі прыходзілася 76 чал. старэй за 60 гадоў, у 1959 г. – 107, у 1970 г. – 131, у 1975 г. – 145 чал.

Старэнню грамадства спрыялі перш за ўсё паляпшэнне ўмоў жыцця, медыцынскага абслугоўвання, павышэнне матэрыяльнай забяспечанасці. Ва ўмовах павелічэння ўдзельнай вагі старэйшых узроставых груп у структуры насельніцтва краіны ўвядзенне ўсеагульнага пенсіённага забеспячэння, павышэнне мінімальных памераў пенсій мелі выключна важнае значэнне для росту дабрабыту народа, значна павышалі ролю грамадскіх фондаў спажывання ў фарміраванні жыццёвага ўзроўню сем'яў працаўнікоў. Утрыманне непрацаздольных членаў сем'яў у нейкай меры брала на сябе дзяржава, што палягчала клопат аб іх з боку працаздольных членаў сям'і.

Пенсіённае забеспячэнне рабіла дваякі ўплыў. Яго прамое ўздзеянне заключалася ў тым, што яно спрыяла працягласці жыцця, павышэнню жыццяздольнасці старэйшага пакалення, выкарыстанню яго вопыту, набытых навыкаў для выхавання маладога пакалення, фарміраванню станоўчых якасцей іх характару, захаванню і ўмацаванню традыцый і звычаяў, карысных для грамадства.

Зваротная сувязь выяўлялася ў тым, што пры ўзнагародзе па заслугах мінулай працы стваралася сістэма, выпрацоўваліся вызначаныя нарматывы жыццядзейнасці людзей, стымуляваўся прагрэс рознабаковага развіцця працуючага пакалення.

Як адзначалася вышэй, найважнейшым прынцыпам пенсіённага забеспячэння калгаснікаў з'яўлялася сувязь з вытворчай дзейнасцю, з колькасцю і якасцю працы. Па меры павышэння месячнага заробку павышаўся памер месячнай пенсіі.

Пенсіі прызначаліся членам калгасаў пры наяўнасці 25 гадоў стажу для мужчын і 20 гадоў – для жанчын. Аднак для членаў калгасаў заходніх абласцей рэспублікі, дзе калгасы ствараліся

пазней, пенсіі па старасці прызначаліся пры меншым стажы, пры ўмове ўступлення ў калгас у год яго стварэння.

Вялікае значэнне ва ўдасканаленні сістэмы пенсіённага забеспячэння калгаснікаў мелі рашэнні вераснёўскага 1967 г. Пленума ЦК КПСС па пытанні ўсталявання для членаў калгасаў аднолькавага з рабочымі і служачымі ўзросту пенсій па старасці, павышэння мінімальных памераў пенсій для тых, якія сталі інвалідамі I і II груп з прычыны працоўнага калецтва або прафесійнага захворвання, і адначасовага ўвядзення пенсіённага забеспячэння для інвалідаў III групы.

Да прыняцця Закона аб пенсіях і дапамогах членам калгасаў гаспадаркамі праводзілася разнастайная работа па паляпшэнні сацыяльнага забеспячэння сваіх калгаснікаў. Аднак адсутнасць адзінага парадку ў гэтай жыццёва важнай справе прыводзіла да таго, што калгасы, зыходзячы з сваіх эканамічных магчымасцей, усталёўвалі розны ўзровень пенсіённага забеспячэння, паразнаму вырашалі пытанне вызначэння пенсіённага ўзросту, стажу і ступені працоўнага ўдзелу ў грамадскай вытворчасці. Высокапрыбытковыя гаспадаркі ўсталёўвалі даволі высокі ўзровень пенсіённага забеспячэння. У эканамічна слабых гаспадарках, асабліва размешчаных у неспрыяльных глебава-кліматычных умовах, пенсіі распаўсюджваліся не на ўсіх калгаснікаў, памеры іх былі невялікія.

Такая дыферэнцыяцыя пенсіённага забеспячэння калгаснікаў прыводзіла да паглыблення сацыяльна-эканамічнай няроўнасці ў сярэдзіне калгаснага сектара, не забяспечвала грамадска неабходны ўзровень надзённых патрэбнасцей калгаснікаў.

Адной з праблем сацыяльнага забеспячэння з'яўлялася вызначэнне пенсіённага ўзросту. У параўнанні з еўрапейскімі краінамі (акрамя Аўстрыі, дзе пенсіённы ўзрост быў такі ж, як у СССР) у Савецкім Саюзе быў самы нізкі пенсіённы ўзрост. Так, у ЗША і ФРГ пенсіённы ўзрост для мужчын складаў 65 гадоў, для жанчын – 60 гадоў. У Іспаніі і Галандыі права на пенсію атрымлівалі працоўныя (мужчыны і жанчыны) у 65 гадоў, у Швецыі і Ісландыі – у 67 гадоў, у Ірландыі і Нарвегіі – у 70 гадоў.

Ужо з 1968 г. у СССР быў усталяваны аднолькавы пенсіённы ўзрост для рабочых, служачых і калгаснікаў. Для рабочых саўгасаў і дзяржаўных прадпрыемстваў існавала градацыя ўзросту ў залежнасці ад умоў працы. Так, пенсіённы ўзрост для рабочых, занятых на вытворчасці са шкоднымі ўмовамі працы, быў паніжаны. У калгаснай вытворчасці таксама мелі месца работы, якія неабходна было б адносіць да шкодных і цяжкіх. Да прыкладу, праца каваля, малатабойца, газазваршчыка, праца з ядахімікатамі, праца на найболей працаёмкіх участках жывёлагадоўлі і інш.

У даследуемы перыяд склалася даволі складаная сітуацыя, калі частка спецыялістаў-механізатараў сельскай гаспадаркі, занятых на працах са шкоднымі і цяжкімі ўмовамі працы ў саўгасах, карысталіся правам ільготнага выхаду на пенсію і льготнага забеспячэння пенсіяй, а іншая частка такіх жа спецыялістаў, якія працавалі ў аналагічных умовах у калгасах, такімі правамі не карысталіся. Для калгаснікаў, занятых на працы са шкоднымі ўмовамі, льготы па пенсіённым забеспячэнні былі не прадугледжаны. Аднак у многіх гаспадарках для гэтых асоб быў усталяваны шэраг пераваг і льгот у аплаце працы: яны карысталіся скарочаным працоўным днём, атрымлівалі за кошт калгасаў дадатковыя прадукты, спецвопратку і г. д. Але такія льготы значна саступалі дзяржаўным.

Такім чынам, падчас удасканалення сістэмы сацыяльнага забеспячэння калгаснага сялянства ствараліся перадумовы для ўвядзення дыферэнцыяцыі ўмоў працы калгаснікаў, занятых у вытворчасці са шкоднымі і цяжкімі ўмовамі працы, прадастаўлення такіх ільгот па пенсіённым забеспячэнні, якія адпавялі тым, якімі карысталіся рабочыя саўгасаў і дзяржаўных прадпрыемстваў.

У далейшым, у адпаведнасці з рашэннямі XXIV з'езда КПСС, з 1 ліпеня 1971 г. былі павялічаны мінімальныя памеры пенсій членам калгасаў па старасці, I, II і III груп інваліднасці з прычыны працоўнага калецтва і прафесійнага захворвання і I і II груп з прычыны агульнага захворвання, а таксама павышаны пенсіі ў выпадку страты кармільца. У цэлым, у восьмай і дзявятай пяцігодках па ўмовах прызначэння пенсій калгаснікі былі прыраўнаваны да рабочых і служачых.

Ажыццяўленне ўказаных мерапрыемстваў фактычна азначала стварэнне адзінай для ўсіх пластоў грамадства сістэмы пенсіённага забеспячэння. На 1 студзеня 1975 г. з 44,4 млн агульнай



Рэпазіторый БНТУ

колькасці пенсіянераў у краіне 12,1 млн чал. складалі пенсіянеры-калгаснікі [16, с. 229]. Па Беларускай ССР на 1 студзеня 1975 г. агульная колькасць калгаснікаў, якія атрымоўвалі пенсіі ў цэнтралізаваным парадку, складала 710 тыс. чал., з іх атрымоўвалі пенсіі па старасці – 603 тыс. чал. [17, с. 150].

Больш поўны ахоп цэнтралізаваным пенсіённым забеспячэннем членаў калгасаў абумовіў адносна невысокі рост выдаткаў на гэтыя мэты з унутрыгаспадарчых грамадскіх фондаў спажывання калгасаў рэспублікі. У сувязі з ажыццяўленнем вызначаных новых мерапрыемстваў па павышэнні мінімальных памераў пенсій калгаснікам, увядзенні надбавак да пенсій калгаснікам-інвалідам I групы і павышэнні памераў пенсій па інваліднасці з дзяцінства, а таксама ўраўнаванні (пры прызначэнні пенсій па старасці) стажу працы ў калгасе са стажам працы ў дзяржаўным сектары грамадскай вытворчасці выдаткі калгасаў на гэтыя мэты сталі скарачацца.

Аднак, як сведчыць праведзены вышэй аналіз, памеры пенсій калгаснікаў былі невялікія. Да таго ж большасць калгаснікаў атрымлівалі мінімальны памер пенсій, на які пражыць было проста немагчыма, нягледзячы на дадатковы прыбытак ад асабістай гаспадаркі. У выніку многія з іх вымушаны былі працягваць працаваць і пасля наступлення пенсіённага ўзросту. У некаторых гаспадарках іх колькасць дасягала 80% [18, с. 395].

Разам з тым у гэты перыяд узраслі выдаткі калгасаў, звязаныя з больш шырокім распаўсюджаннем у калгасна-кааператыўным сектары прагрэсіўнага вопыту перадавых гаспадарак па ўвядзенні за асобыя заслугі перад калгаснай вытворчасцю персанальных пенсій – даплат да пенсій, якія паступалі з цэнтралізаванага саюзнага фонду. Праўда, гэтыя пенсіі-даплаты не насілі абавязковага ўсеагульнага характару для ўсіх гаспадарак, тым больш для ўсіх калгаснікаў-пенсіянераў [19, с. 46]. Іх прызначэнне нічым не рэгламентавалася і цалкам залежала ад ініцыятывы саміх працоўных калектываў асобных калгасаў і іх кіраўнікоў.

Такім чынам, асноўным дасягненнем у гэты перыяд з'явілася ў асноўным завяршэнне станаўлення сістэмы сацыяльнай абароны калгаснага сялянства. Гэта спрыяла паляпшэнню ўмоў працы і побыту, істотнаму павышэнню жыццёвага ўзроўню працаўнікоў калгаснай вытворчасці.

Стварэнне адзінай сістэмы сацыяльнага страхавання калгаснікаў, заснаванай на прынцыпах сацыяльнай абароны рабочых і служачых, увядзенне дзяржаўнага пенсіённага забеспячэння членам калгасаў спрыялі росту яго працоўнай актыўнасці, выраўнаванню і збліжэнню матэрыяльных і культурна-бытавых умоў жыцця працаўнікоў дзяржаўнага і калгасна-кааператыўнага сектараў грамадскай вытворчасці.

Тым не менш забяспечанасць калгаснага сялянства з грамадскіх фондаў спажывання, як і агульны ўзровень яго дабрабыту, была недастатковай. У некаторых гаспадарках асноўная функцыя вышэйадзначаных фондаў заключалася ў падтрыманні на пэўным узроўні аплаты працы сваіх працаўнікоў. Нізкім заставаўся ўзровень яго пенсіённага забеспячэння. Развіццё сістэмы сацыяльнага страхавання калгаснікаў ускладнялася тым, што пытаннямі сацыяльнага страхавання займаліся розныя органы. Напрыклад, выдачай дапамогі па часовай непрацаздольнасці, на нараджэнне дзіцяці, пахаванне, санаторна-курортнае лячэнне, па перакваліфікацыі займаліся прафесійныя саюзы. Дапамога па цяжарнасці і родах знаходзілася ў распараджэнні органаў сацыяльнага забеспячэння. Да таго ж сродкі цэнтралізаванага фонду сацыяльнага страхавання калгаснікаў выкарыстоўваліся ў недастатковай меры. Нягледзячы на рост планавых выдаткаў, частка грашовых сродкаў заставалася нявыкарыстанай.

Стрымліваючым фактарам у павышэнні жыццёвага ўзроўню калгаснага сялянства з'явіўся недастатковы ўзровень развіцця прадукцыйных сіл вёскі, а таксама недасканаласць існуючых на сяле размеркавальных адносін. Адмоўна адбілася на гэтых працэсах і вынікаючая з пануючай ідэалогіі недаацэнка месца і ролі сялянства ў жыцці грамадства і дзяржавы.

### Літаратура

1. Материалы о работе республиканского Совета социального обеспечения колхозников за 1965 г. // НАРБ. – Фонд 102. – Оп. 3. – Д. 353а. – Л. 1–295.

2. Материалы о работе республиканского Совета социального обеспечения колхозников за 1966 г. // НАРБ. – Фонд 102. – Оп. 3. – Д. 374. – Л. 1–301.

3. Материалы о работе республиканского Совета социального обеспечения колхозников за 1967 г. // НАРБ. – Фонд 102. – Оп. 3. – Д. 393. – Л. 1–250.
4. Материалы о работе республиканского Совета социального обеспечения колхозников за 1969 г. // НАРБ. – Фонд 102. – Оп. 3. – Д. 4356. – Л. 1–211.
5. Сводные отчеты районных управлений Витебской области по основной деятельности за 1970 г. // НАРБ. – Фонд 48. – Оп. 9. – Д. 1801. – Т. 1. – Л. 1–204.
6. Справки и информация Белсовпрофа, облсовпрофов и БРК профсоюзов о состоянии медицинского обслуживания трудящихся и осуществлении санаторно-курортного лечения и санитарно-оздоровительных мероприятий // НАРБ. – Фонд 265. – Оп. 9. – Д. 772. – Л. 1–240.
7. Сводные отчеты районных управлений Могилевской области по основной деятельности за 1970 г. // НАРБ. – Фонд 48. – Оп. 9. – Д. 1809. – Т. 2. – Л. 1–114.
8. Сводные отчеты районных управлений Могилевской области по основной деятельности колхозов за 1975 г. // НАРБ. – Фонд 48. – Оп. 14. – Д. 1189. – Т. 3. – Л. 1–220.
9. Финансовый отчет Белсовпрофа, облсовпрофов и БРК профсоюзов об исполнении бюджета государственного социального страхования за 1970 г. // НАРБ. – Фонд 265. – Оп. 9. – Т. 2. – Д. 790. – Л. 1–127.
10. Финансовый отчет Белсовпрофа, облсовпрофов об исполнении бюджета государственного социального страхования за 1974 г. // НАРБ. – Фонд 265. – Оп. 9. – Д. 1521. – Л. 1–227.
11. Планы распределения путевок в санатории и дома отдыха на 1970 г. // НАРБ. – Фонд 265. – Оп. 9. – Д. 769. – Л. 1–107.
12. Пояснения к сводным отчетам районных управлений Гродненской области по основной деятельности за 1970 г. // НАРБ. – Фонд 48. – Оп. 9. – Д. 1824. – Л. 1–250.
13. Сводные отчеты районных управлений Гродненской области по основной деятельности колхозов за 1975 г. // НАРБ. – Фонд 48. – Оп. 14. – Д. 1180. – Т. 2. – Л. 1–238.
14. Население СССР (численность, состав и движение населения). 1973. Стат. сб. / Центр. стат. упр. – М.: Статистика, 1975. – 333 с.
15. Итоги Всесоюзной переписи населения 1959 г. СССР (сводный том) / Центр. стат. упр. – М.: Госстатиздат, 1962. – 284 с.
16. Народное хозяйство СССР за 60 лет: Юбилейный стат. сб. / Центр. стат. упр. – М.: Статистика, 1977. – 710 с.
17. Народное хозяйство Белорусской ССР. 1975. Стат. ежегодник / Центр. стат. упр. – Минск: Беларусь, 1975. – 333 л.
18. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 1994 – 1995. – Ч. 2: Нарысы гісторыі Беларусі / М. Касцюк [і інш.]. – 1995. – 560 с.
19. Гісторыя Беларускай ССР: у 5 т. / рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старшыня) [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – Т. 5: Беларуская ССР у перыяд стварэння развітога сацыялістычнага грамадства і будаўніцтва камунізму (1945–1974 г.) / А. А. Філімонаў [і інш.]. – 776 с.

*N. V. ZAITSAVA*

**FORMATION OF THE KOLKHOZ PEASANTRY SOCIAL PROTECTION IN THE BSSR (1966–1975)**

## Summary

The article is devoted to the problem of the social protection system improvement for the collective-farmers in 1966–1975. In that period main achievements in the economic development, including its agricultural sector, have made the necessary possibilities for modernization and installation social protection systems for the collective-farmers. This questions are important to study the social and living conditions of Belarusian kolkhoz peasantry.

Репозиторий БНТУ